# АБІТУРЫЕНТ

*Дадатак да "Настаўніцкай газеты"* 15 верасня 2011 года

**Ці трэба ўводзіць мінімальны станоўчы бал пры паступленні ў ВНУ?**
**Абмен меркаваннямі**
**Стар. 6—9**

**45 чалавек на месца!**
**Абітурыенткі штурмуюць Акадэмію МУС**
**Стар. 10**

**Вы пыталіся…**
**Ці можна плаціць за вучобу ў растэрміноўку?**
**Стар. 11**

**Уступная кампанія ў ССНУ**
**Абітурыентаў шукалі нават ва Украіне і Расіі**
**Стар. 12**




## “З грамадазнаўства пераключаемся на вышэйшую матэматыку і замежныя мовы”

***Аляксей Міхайлаў, выпускнік Гомельскай Ірынінскай гімназіі, і Яўгенія Вакуленка, выпускніца Магілёўскай гімназіі № 3, — пераможцы рэспубліканскай алімпіяды па грамадазнаўстве 2011 года, якія скарысталіся сваім правам паступлення без уступных іспытаў на самы прэстыжны факультэт краіны — факультэт міжнародных адносін Белдзяржуніверсітэта, дзе сёлета, між іншым, зарэгістраваны адзін з самых высокіх прахадных балаў — 369.***

Па словах Аляксея, яшчэ ў 9 класе ён зацікавіўся грамадазнаўствам, прычым адным з матываў займацца паглыблена гэтым прадметам была магчымасць паступлення на ФМА. Па меркаванні студэнта, да алімпіяды было рыхтавацца цікавей, чым да цэнтралізаванага тэсціравання (ён удзельнічаў у адным з рэпетыцыйных тураў), паколькі “алімпіяда — гэта вялікія аб’ёмы новай інфармацыі, аналіз, развіццё мыслення, а ЦТ — больш механічнае завучванне”. На працягу трох гадоў ён чытаў і аналізаваў дадатковую літаратуру па паліталогіі, філасофіі, сацыялогіі і іншых дысцыплінах, з якіх складаецца грамадазнаўства, і па ўзроўні ведаў у гэтых галінах ужо на момант алімпіяды цалкам мог бы канкурыраваць са студэнтамі. Аляксей лічыць, што льгота, якой ён скарыстаўся пры паступленні, цалкам адэкватная яго намаганням. “Прадастаўленне права пераможцам алімпіяд паступаць у ВНУ без экзаменаў я расцэньваю як аванс адораным маладым людзям, які ў будучыні дзяржаве павінен акупіцца”, — зазначыў студэнт. Але, нават па меркаванні саміх пераможцаў, колькасць дыпломаў алімпіяды можна і абмежаваць. Так лічыць, напрыклад, уладальнік дыплома III ступені Яраслаў Ракутаў, выпускнік Гадзілавіцкай школы Рагачоўскага раёна, зараз таксама першакурснік ФМА.

На першым курсе факультэта міжнародных адносін займаюцца 13 пераможцаў рэспубліканскай алімпіяды па грамадазнаўстве. Маладыя людзі, якія паглыблена займаліся сацыяльнымі дысцыплінамі, зараз вывучаюць… асновы вышэйшай матэматыкі і замежную мову. Па словах тых першакурснікаў, з якімі ўдалося пагутарыць, вышэйшая матэматыка для іх не ўяўляе складанасці, паколькі гэта ўсяго толькі асновы. А вось за замежную мову, якой на факультэце міжнародных адносін удзяляецца вельмі шмат увагі, прыйдзецца брацца ўсур’ёз, тым больш што на другім курсе дадаецца яшчэ адна мова.

Галоўнае, што студэнты поўныя энтузіязму, рашучасці і настроены на вучобу, значыць, справяцца з любымі цяжкасцямі ўніверсітэцкага жыцця.

**Іна НІКІЦЕНКА.**
*nikitsenka@nastgaz.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

# Ці трэба ўводзіць мінімальны

**Пасля падвядзення вынікаў на ўзроўні Міністэрства адукацыі і Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у ВНУ і ССНУ было афіцыйна абвешчана: Правілы прыёму працуюць ужо пяць гадоў, яны сябе апраўдалі, але надышоў час новай рэдакцыі. Сапраўды, гэтага патрабуюць такія сучасныя рэаліі, як паступовая аўтаматызацыя ўступнай кампаніі, дэмаграфічны спад, масавасць і даступнасць (магчыма, празмерная) вышэйшай адукацыі, новыя патрабаванні рынку працы і г.д.**
**Навіна аб верагоднай карэкціроўцы Правіл прыёму выклікала заўважны рух у вышэйшай школе: вынікі штогадовага аналізу ўступнай кампаніі, заўвагі і прапановы ВНУ наконт удасканалення прыёму зараз маюць шанс быць замацаванымі нарматыўна. Сёння ў дадатку "Абітурыент" мы арганізавалі абмеркаванне найбольш надзённых пытанняў, якія хвалююць прадстаўнікоў ВНУ, і плануем звяртацца да такога абмену меркаваннямі на працягу года.**

## *Як абмежаваць доступ у ВНУ абітурыентаў з вельмі нізкай падрыхтоўкай?*

**Юрый Быкадораў, прарэктар па вучэбнай рабоце Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка:**

— У гэтым годзе абітурыенты з нізкімі баламі змаглі паступіць на спецыяльнасці, звязаныя з фізікай і філалогіяй. Што да першага прадмета, то ўжо апошніх гадоў 15, прычым не толькі ў нашай краіне, моладзь, мякка кажучы, яго "недалюблівае". Чаму? Магчыма, таму што варыянтаў для працаўладкавання фізікаўтэарэтыкаў няшмат: акадэмія навук, фізічны факультэт БДУ, БДПУ ці рэгіянальнага ўніверсітэта. Што да філалогіі, то тут я бачу прамую сувязь з рынкам працы: ён перанасычаны філолагамі. Таму абітурыенты задаюцца пытаннем: ці знойдуць яны работу з такой спецыяльнасцю?

Колькасць месцаў у ВНУ даволі вялікая, а колькасць удзельнікаў конкурсу істотна ніжэйшая, чым у мінулыя гады, таму на асобных факультэтах мы і назіраем такую "амплітуду" сярэдніх балаў: ад даволі высокіх да вельмі нізкіх. Праблему можна было б лёгка вырашыць, скарачаючы прыём на бюджэтную форму навучання. На фізічны факультэт, напрыклад, БДПУ прымае 125 чалавек, прыкладна столькі ж — на матэматычны факультэт, бо ў школе не хапае настаўнікаў фізікі і матэматыкі. Мы дакладна разумеем: той, хто не зможа вучыцца, будзе адлічаны. Але спачатку шанс даём усім, хто паступіў.

Зрэшты, універсітэт гатовы ўстанавіць пэўную мяжу мінімальнага станоўчага бала па прадметах, бо калі з дзвюх бед выбіраць адну, то ўсё ж лепш недабраць, чым дабраць тых, у каго 1-2 балы па профільным прадмеце. Адпаведную прапанову, дарэчы, мы ўжо два гады запар уносім у выніковую справаздачу камісіі па кантролі, якая працуе ва ўніверсітэце падчас прыёмнай кампаніі.

**Вячаслаў Малафееў, адказны сакратар прыёмнай камісіі БДУ, дэкан факультэта даўніверсітэцкай адукацыі:**

— Увядзенне ніжняй планкі пры паступленні ў ВНУ апраўдана, па меншай меры па профільных прадметах, бо нават калі ўніверсітэты і прымаюць абітурыентаў з нізкімі баламі, то гэта да першай сесіі. У сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных установах уводзіць такую планку неабходнасці няма, бо там патрабаванні да фундаментальнай падрыхтоўкі ніжэйшыя або зусім адсутнічаюць і адразу ідзе практыка-арыентаванае навучанне. А ва ўніверсітэце любая спецыяльнасць патрабуе глыбокага асваення фундаментальных ведаў, без якіх немагчыма рухацца далей.

**Генадзь Гачко, дэкан фізіка-тэхнічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы:**

— Лічу, што выдаваць сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання трэба з любой колькасцю набраных балаў. Аднак у Правілах прыёму ў ВНУ і ССНУ варта прадугледзець механізм заліку (незаліку) сертыфіката ў залежнасці ад узроўню адукацыі і профілю спецыяльнасці. Напрыклад, для спецыяльнасцей вышэйшай адукацыі тэхнічнага профілю ўстанавіць заліковыя балы па беларускай і рускай мове ў 20 балаў і вышэй, а па фізіцы і матэматыцы — 30 балаў і вышэй. Для спецыяльнасцей сярэдняй спецыяльнай адукацыі гэтыя парогі могуць быць крыху ніжэй. Канкрэтныя лічбы мэтазгодна зацвярджаць штогод на ўзроўні Міністэрства адукацыі на аснове аналізу вынікаў ЦТ у бягучым годзе. Гэта дазволіць, з аднаго боку, рэгуляваць патокі абітурыентаў паміж ВНУ і ССНУ, а з другога — павысіць адказнасць абітурыентаў як на этапе падрыхтоўкі да ЦТ, так і непасрэдна пры яго правядзенні.

**Сяргей Барвенаў, дацэнт механіка-матэматычнага факультэта БДУ:**

— Несумненна, увядзенне ніжняй планкі дысцыплінавала б школьнікаў, іх бацькоў і настаўнікаў. Варта ўвесці мінімальны бал, які дае права прэтэндаваць на бюджэтныя месцы, у раёне 30—40 балаў! Менавіта такое мінімальнае веданне кожнага з прадметаў гаворыць аб тым, што ў далейшым студэнт будзе сур'ёзна ставіцца да вучобы ў вышэйшай навучальнай установе. У той жа час лічу, што ўвядзенне ніжняй планкі — гэта не прэрагатыва РІКВ ці Міністэрства адукацыі. Іх задача — даць незалежную ацэнку ведаў усіх абітурыентаў. Што рабіць з атрыманымі баламі — справа ВНУ, якія павінны самі прымаць рашэнне аб тым, ці змогуць яны вучыць на першым курсе чалавека, які набраў, напрыклад, 10 балаў па матэматыцы ці хіміі. Калі кіраўніцтва ВНУ чамусьці лічыць, што з такога абітурыента атрымаецца добры студэнт, — гэта павінна быць яго правам.

**Васіль Бандарык, адказны сакратар прыёмнай камісіі БДУІР, дэкан факультэта бесперапыннага і дыстанцыйнага навучання:**

— Як выкладчык я, безумоўна, за ўвядзенне ніжняй планкі пры паступленні ва ўніверсітэт, але ў той жа час трэба разумець, што абітурыентаў становіцца ўсё менш, і ВНУ мусяць браць тых, хто ёсць. Гэта вымушаны шлях — прымаць амаль усіх, а потым ужо па выніках сесіі адлічваць тых, хто не спраўляецца з праграмай. Такі падыход мае права на існаванне, адзінае, што не ўсе студэнты і бацькі гатовы да выключэння.

Акрамя таго, адсутнасць ніжняй планкі не стымулюе школьнікаў да вучобы. Калі бацькі загадзя пагаджаюцца аплачваць вучобу, то дзеці (а многіх цікавіць не пэўная прафесія, а толькі вышэйшая адукацыя) не бачаць сэнсу ў сур'ёзнай падрыхтоўцы. Яны ведаюць, што ў любым выпадку атрымаюць нейкія балы і паступяць практычна ў любую ВНУ. І такіх абітурыентаў, на жаль, вельмі многа. Ніжняя планка магла б перакрыць ім шлях у ВНУ, але тады захаваецца рызыка незапаўнення бюджэтных месцаў па шэрагу спецыяльнасцей. Тут трэба выбіраць.

**Алег Родзькін, прарэктар па вучэбнай рабоце Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага ўніверсітэта імя А.Д.Сахарава:**

— Мы праводзілі аналіз таго, колькі нашых абітурыентаў мы не змаглі б залічыць, калі б была ўведзена ніжняя планка. Калі б яна складала 5 балаў, то за межамі ВНУ засталося б каля 3% ад колькасці залічаных, 10 балаў — адпаведна, каля 6%. Я лічу, што мінімальны бал павінен быць уведзены недзе ў гэтым дыяпазоне — ад 5 да 10 балаў.

Сёлета ў лік студэнтаў нашага ўніверсітэта прыняты абітурыент з атэстатам у 32 балы. Яго адзнакі па прадметах ЦТ вагаюцца ад 15 да 20 балаў. Гэта, відома, не лепшы паказчык, але ж усё пазнаецца ў параўнанні: у прыватнасці, гэты абітурыент атрымаў больш высокія балы па прадметах, чым некаторыя абітурыенты з атэстатам 80 балаў і вышэй. У чым прычына? Можа быць, яго недаацанілі ў школе, быў канфлікт з педагогамі і г.д. У любым выпадку мы, вядома, паспрабуем, каб у нашай ВНУ гэты студэнт атрымаў усе неабходныя веды і годна яго закончыў.

Мы ўдзяляем першакурснікам асаблівую ўвагу. Ва ўніверсітэце распрацаваны "Парады першакурсніку", дзе выкладзены базавыя прынцыпы паспяховага навучання. Пастаянна аналізуецца паспяховасць студэнтаў 1 курса і ўносяцца карэктывы. У прыватнасці, арганізоўваюцца дадатковыя заняткі і кансультацыі для тых, хто адстае. Наша практыка паказвае, што калі першакурснік з самага пачатку настроены на вучобу, не прапускае заняткі, імкнецца атрымаць веды, то ён у канчатковым выніку атрымае дыплом нават пры слабай стартавай падрыхтоўцы.

На вялікі жаль, пасля першай сесіі мы адлічваем ад 5 да 10% студэнтаў. Дарэчы, галоўнай прычынай іх непаспяховасці з'яўляюцца пропускі заняткаў, несур'ёзнае, "дзіцячае" стаўленне да вучобы.

Хацелася б растлумачыць будучым абітурыентам, што ўжо ў школе прыярытэтнымі павінны стаць добрая вучоба і набыццё ведаў. Тым не менш калі пры паступленні ўсталяваць ніжнюю мяжу балаў, то гэта аўтаматычна будзе стымуляваць школьнікаў да больш якаснай падрыхтоўкі. Але гэтая мяжа не павінна быць вельмі высокай. Вопыт паказвае, што некаторыя абітурыенты, якія маюць нізкія балы, пасля залічэння ў шэрагі студэнтаў і належнай упартай працы хутка даганяюць сваіх сакурснікаў і потым становяцца добрымі спецыялістамі.



**Вячаслаў Малафееў:** *"На жаль, сярод тых, хто паступіў ва ўніверсітэт па-за конкурсам, толькі кожны пяты мае дастаткова высокія балы, каб паспяхова ўключыцца ў вучэбны працэс".*



**Васіль Бандарык:** *"Адсутнасць ніжняй планкі не стымулюе школьнікаў да вучобы. Калі бацькі загадзя пагаджаюцца аплачваць вучобу, то дзеці (а многіх цікавіць не пэўная прафесія, а толькі вышэйшая адукацыя) не бачаць сэнсу ў сур'ёзнай падрыхтоўцы".*



**Аляксандр Малярэвіч:** *"З балам ніжэй за 5, на мой погляд, увогуле непрыстойна падаваць дакументы ў ВНУ".*

# станоўчы бал пры паступленні ў ВНУ?

Ці трэба скарачаць набор на незапатрабаваныя абітурыентамі спецыяльнасці? Думаю, што ён скароціцца натуральным чынам: маладыя людзі проста перастануць падаваць дакументы і паступаць на спецыяльнасці, якія ім не цікавыя, пасля заканчэння якіх могуць узнікнуць праблемы з працаўладкаваннем, у перспектыве чакае нізкая заработная плата і г.д.

Іншае пытанне, што не заўсёды перспектыўныя і неабходныя для эканомікі краіны спецыяльнасці з'яўляюцца цікавымі для патэнцыяльных абітурыентаў. Перш за ўсё гэта тычыцца новых спецыяльнасцей, якія яшчэ "не раскручаны" ў належнай меры.

**Аляксандр Малярэвіч, адказны сакратар прыёмнай камісіі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, дэкан прыборабудаўнічага факультэта:**

— У свой час так званая ніжняя планка ўжо ўводзілася Міністэрствам адукацыі, і калі абітурыент не дасягаў яе, то мог паступаць толькі ў ССНУ ці вучылішча, дзе рыхтуюць спецыялістаў больш нізкай кваліфікацыі. Лічу, што такая планка павінна быць. Гэта мабілізуе абітурыентаў, бо не сакрэт, што частка з іх ідзе на цэнтралізаванае тэсціраванне, нават не збіраючыся выконваць тэст, а проста выстаўляе крыжыкі наўгад. Дарэчы, часткова таму паказчыкі ЦТ па такіх складаных прадметах, як фізіка і матэматыка, штогод пагаршаюцца. У БНТУ рэгулярна праводзяцца кантрольныя зрэзы ўзроўню ведаў сярод студэнтаў, і ўстаноўлена, што іх вынікі цалкам карэлююць з вынікамі цэнтралізаванага тэсціравання. У цэлым жа па сярэднім бале ЦТ нельга меркаваць аб узроўні падрыхтоўкі абітурыентаў і аб тым, падае ён ці павышаецца. Хаця б таму, што значная колькасць удзельнікаў тэсціравання тэсты не рашае. Пры ўвядзенні ніжняй планкі па прадметах такіх фактаў не будзе і мы ў ВНУ не ўбачым сертыфікатаў з адзнакамі 1, 2... Дарэчы, на творчых экзаменах у ВНУ, якія ацэньваюцца па 10-бальнай сістэме, гэтыя адзнакі лічацца адмоўнымі і не дазваляюць абітурыенту працягваць іспыты.

На мой погляд, вакол фактаў з паступленнем у ВНУ абітурыентаў з вельмі нізкай падрыхтоўкай неяк штучна напампоўваецца ўвага. Не варта так драматызаваць сітуацыю, бо насамрэч такіх абітурыентаў у нашым універсітэце зусім няшмат. На прыборабудаўнічым факультэце іх, напрыклад, літаральна 10—15 пры наборы больш за 300 чалавек на дзённую форму, прычым з улікам платнага аддзялення, дзе звычайна на надзённую форму навучання балы ніжэй, чым на бюджэтным.

Пад вельмі нізкімі баламі я маю на ўвазе балы ніжэй за 10. З балам па прадмеце ніжэй за 5, на мой погляд, увогуле непрыстойна падаваць дакументы ў ВНУ. Лічу, што мінімальная станоўчая адзнака пры паступленні ва ўніверсітэт павінна складаць 10—15 балаў, хаця на гэты конт, канечне, патрэбен грунтоўны аналіз.

Калі ж абітурыент з-за гэтых абмежаванняў не паступіць у ВНУ, то ён мае магчымасць пайсці ў каледж абсо асвоіць рабочую спецыяльнасць. Вядома, што ў краіне існуе вялікі недахоп кваліфікаваных працоўных кадраў. А потым, працоўны на прадпрыемстве, можна атрымаць вышэйшую адукацыю завочна. У БНТУ больш за 60 філіяў кафедр на вядучых прадпрыемствах краіны, і студэнт-завочнік можа вучыцца літаральна побач са сваім працоўным месцам. Акрамя таго, па шэрагу спецыяльнасцей у БНТУ вышэйшую адукацыю завочна можна атрымаць не за 6, а за 4 гады. Гэта тычыцца выпускнікоў каледжаў, з якімі мы заключылі адпаведныя пагадненні.

Як са слабымі першакурснікамі працуе ўніверсітэт? Не сакрэт, што гэта галоўныя кандыдаты на адлічэнне. Але першапачаткова мы спрабуем іх навучыць, сочым за іх вучобай, наведваннем заняткаў. Слабы студэнт, які стараецца вучыцца, можа стаць калі не лепшым, то сярэднестатыстычным спецыялістам. Мы арыентуем выкладчыкаў на індывідуальную работу, са слабымі студэнтамі праводзяцца дадатковыя заняткі, у тым ліку і на платнай аснове.

Падчас прафарыентацыйных мерапрыемстваў мы настройваем школьнікаў на тое, што ў БНТУ вучыцца складана. Тут яны асвояць спецыяльнасці, вельмі запатрабаваныя нашай прамысловасцю, і атрымаюць шырокія перспектывы з пункта гледжання кар'еры і заробкаў. Але наша галоўная мэта — не адштурхнуць слаба падрыхтаваных дзяцей і не проста прыцягнуць школьнікаў з высокай падрыхтоўкай, а знайсці па-сапраўднаму матываваных абітурыентаў, якія асэнсавана выбіраюць будучыя спецыяльнасці.

## Ці варта павялічваць час на цэнтралізаванае тэсціраванне?

**Генадзь Гачко:**

— Упэўнены, што працягласць работы абітурыентаў над педагагічнымі тэстамі павінна вызначацца колькасцю і ўзроўнем складанасці заданняў. На падставе свайго вопыту работы ў арганізацыйнай камісіі па правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання магу сцвярджаць, што мяняць працягласць работы над тэстамі не варта. Штогод мы назіраем сітуацыю, калі праз 30—45 хвілін з пачатку ЦТ абітурыенты ў масавым парадку здаюць свае работы. Магчыма, у значнай ступені гэта звязана і з тым, што быў адменены парог для выдачы сертыфікатаў. А калі ёсць праблемы з вынікамі тэсціравання па некаторых прадметах, то варта скарэкціраваць узровень складанасці або аб'ём заданняў педагагічных тэстаў.

**Сяргей Барвенаў:**

— Усе ўдзельнікі тэсціравання (у тым ліку і правяраючыя) адзначаюць, што ўжо праз 30—40 хвілін значная частка аўдыторый пусцее больш чым напалову, гэта значыць, многім абітурыентам увогуле не зразумела, што рабіць на ЦТ. Што тычыцца тых, хто рыхтаваўся да экзамену, то захоўваць канцэнтрацыю на працягу 180 хвілін (а менавіта столькі часу адводзіцца, напрыклад, на рашэнне заданняў па матэматыцы) і так вельмі-вельмі складана. Практычна ні разу ў сваім школьным жыцці вучань не сутыкаўся з неабходнасцю займацца адным прадметам бесперапынна на працягу 4 урокаў.

Далейшае павелічэнне часу наўрад ці палепшыць сярэдні бал ці аблегчыць жыццё абітурыентам. Тым больш што першапачаткова (у першыя гады правядзення ЦТ) на выкананне тэстаў адводзілася намнога менш часу. І з той пары карэкціроўка ўжо праводзілася.

**Васіль Бандарык:**

— Па нашых назіраннях, прыкладна трэцяя частка абітурыентаў пакідае аўдыторыі ўжо праз паўгадзіны пасля пачатку тэсціравання. Сёлета на ЦТ па фізіцы ўжо за паўтары (!) гадзіны да завяршэння іспыту ў аўдыторыі засталося 20% абітурыентаў, а апошні чалавек пакінуў аўдыторыю за паўгадзіны да заканчэння ЦТ. Такім чынам, часу хапіла ўсім нават з лішкам.

**Вячаслаў Малафееў:**

— У нас здараюцца выпадкі, калі абітурыенты скардзяцца на недахоп часу падчас ЦТ, маўляў, не паспелі перанесці адказы з чарнавіка ў бланк. Канечне, час на выкананне тэстаў можна было б і павялічыць, але не гэта галоўнае. Трэба, каб і ў школе, і ва ўсёй сістэме даўніверсітэцкай падрыхтоўкі, і на рэпетыцыйным тэсціраванні абітурыенты вучыліся тэхніцы работы з тэстамі. Акрамя таго, трэба максімальна павысіць адказнасць тых структур, якія праводзяць рэпетыцыйнае тэсціраванне. Напрыклад, мы ў БДУ выдаляем з аўдыторый і за дапаможнікі, і за мабільныя тэлефоны. Абітурыенты абураліся, маўляў, заплацілі грошы за рэпетыцыйнае тэсціраванне і могуць карыстацца чым заўгодна (гэта ж не ЦТ!). Але мы тлумачым, што рэпетыцыйнае тэсціраванне — гэта, акрамя дэманстрацыі ведаў, яшчэ і знаёмства з новай тэхналогіяй, і мы нясём адказнасць за якасць яго правядзення.

Абітурыентам важна зразумець тэхналогію цэнтралізаванага тэсціравання, і гэта дазволіць ім правільна размеркаваць час. Напрыклад, я некалі актыўна ўдзельнічаў у розных алімпіядах, і для мяне не было праблемай напісаць любую работу, бо як алімпіяднік я быў прывучаны да кантролю часу. Зрэшты, унутраная самаарганізацыя і тайм-кантроль патрэбны пры любой форме іспытаў: будзе гэта кантрольная работа ці пераказ. Адзінае, у школе настаўнік можа дазволіць школьніку завяршыць работу на перапынку, а на ЦТ трэба быць пунктуальным.

## Ці трэба надаць большую вагу профільным іспытам?

**Вячаслаў Малафееў:**

— Мы ўжо прааналізавалі вынікі падрыхтаванасці абітурыентаў, якія былі залічаны сёлета ў БДУ на 1 курс дзённай формы навучання за кошт сродкаў бюджэту, у прыватнасці адносіны сярэдняга бала атэстата і ЦТ па мове (рускай ці беларускай) да двух профільных прадметаў. Атрыманыя лічбы нас уразілі. Так, у сярэднім па ўніверсітэце адзнака па мове і сярэдні бал атэстата складаюць 56%, а профільныя іспыты — 44% ад агульнай колькасці балаў. Прычым на асобных факультэтах ёсць вельмі сур'ёзныя выкіды: так, на біялагічным факультэце мова і сярэдні бал атэстата далі 59%, а профільныя прадметы — 41%, на ваенным, адпаведна, — 60% і 40% і ўжо зусім змрочная сітуацыя на фізічным факультэце, дзе мова і сярэдні бал атэстата складаюць 63%, а фізіка і матэматыка — усяго 37% ад агульнай колькасці балаў.

Атрымліваецца, што адзнакі па профільных прадметах, якія павінны несці інфармацыю пра здольнасці будучых студэнтаў асвойваць праграму пэўнай спецыяльнасці, насамрэч маюць невысокую долю. Таму вельмі лагічнай выглядае прапанова Анатоля Мікалаевіча Рубінава павысіць вагу профільных прадметаў і пры правядзенні конкурсу ў ВНУ да профільных прадметаў выкарыстоўваць пэўны каэфіцыент. Калі такая прапанова будзе рэалізавана, то гэта, безумоўна, дасць магчымасць прымаць ва ўніверсітэт найбольш падрыхтаваную моладзь па канкрэтных профілях.

►►► 8 стар.



**Сяргей Барвенаў:** *"Усе ўдзельнікі тэсціравання (у тым ліку і правяраючыя) адзначаюць, што ўжо праз 30—40 хвілін значная частка аўдыторый пусцее больш чым напалову, гэта значыць, многім абітурыентам увогуле не зразумела, што рабіць на ЦТ".*



**Генадзь Гачко:** *"Заліковыя балы дапамогуць рэгуляваць патокі абітурыентаў паміж ВНУ і ССНУ, а таксама павысяць адказнасць паступаючых".*



**Алег Родзькін:** *"Калі першакурснік са слабай стартавай падрыхтоўкай настроены на вучобу, не прапускае заняткі, імкнецца атрымаць веды, то мае ўсе шансы стаць добрым спецыялістам".*

# Ці трэба ўводзіць мінімальны

◄◄◄ 7 стар.

## Якія льготы трэба захаваць?

**Вячаслаў Малафееў:**

— Калі казаць пра падрыхтаванасць сёлетніх першакурснікаў, якія паступілі ва ўніверсітэт на дзённую форму навучання за кошт сродкаў бюджэту, то балы выпускнікоў мінскіх устаноў адукацыі і выпускнікоў сельскіх школ істотна адрозніваюцца. Так, па матэматыцы сярэдні бал па ўніверсітэце складае 66 (у выпускнікоў мінскіх школ — 71, а ў сельскіх — 52), па фізіцы сярэднеўніверсітэцкі бал — 56 (у мінчан — 60, а ў сельскіх выпускнікоў — 35) і г.д. Дысбаланс існуе, і ў многіх выпадках, калі б не было асобнага конкурсу, сельскім абітурыентам было б праблематычна паступіць ва ўніверсітэт, ва ўсякім разе на спецыяльнасці прыродазнаўчанавуковага профілю. Хаця дзеля справядлівасці трэба сказаць, што на трэць спецыяльнасцей сельскія выпускнікі прайшлі ў БДУ па агульным конкурсе.

Дарэчы, па беларускай мове розніца паміж гарадскімі і сельскімі выпускнікамі невялікая: сярэдні бал па ўніверсітэце — 66, а ў сельскіх выпускнікоў — 62. А вось па біялогіі сярэднеўніверсітэцкі бал — 63, у сельскіх дзяцей — 46; па хіміі сярэдні бал па ўніверсітэце — 60, а ў сельскіх — 51, па англійскай мове, адпаведна, — 75 і 52 балы... Іншымі словамі, праблема ёсць.

Цікава, што пры гэтым атэстаты ў сельскіх выпускнікоў вельмі добрыя: калі ў сярэднім па ўніверсітэце мы маем у атэстаце 9 балаў, то ў сельскіх выпускнікоў балы атэстата — 9,2.

Зрэшты, мы не прыхільнікі таго, каб адназначна адмаўляць раздзельны конкурс для сельскіх і гарадскіх выпускнікоў. Адзінае, трэба больш жорстка падысці да вызначэння прапорцыі, згодна з якой павінна праводзіцца залічэнне абітурыентаў, бо зараз нават калі адзін сельскі абітурыент падаў заяву на пэўную спецыяльнасць, то ён, незалежна ад сваіх вынікаў, павінен быць залічаны. І такіх выпадкаў здараецца даволі шмат. Напрыклад, сёлета фактычна па-за конкурсам у БДУ было залічана каля 15 сельскіх выпускнікоў. Дык вось, такую сітуацыю трэба выключаць.

Тое ж тычыцца і пазаконкурснага залічэння, дзе сітуацыя вельмі складаная. Так, па цэлым шэрагу спецыяльнасцей адставанне льготнікаў ад тых, хто паступаў ва ўніверсітэт у адпаведнасці са сваімі ведамі, велізарнае, часам яно дасягае 200 балаў. У сёлетніх першакурснікаў, якія былі залічаны па-за конкурсам, сярэдні бал атэстата таксама значна ніжэйшы за ўніверсітэцкі — 8,0 і балы па прадметах не лепшыя: так, сярэдні бал па матэматыцы — 41, па фізіцы — 42, па беларускай мове — 38, па рускай — 41, па біялогіі — 30, па хіміі — 29. Як бачым, адставанне вельмі вялікае, і ўзнікае пытанне, ці змогуць такія абітурыенты засвойваць універсітэцкую праграму ў аўдыторыях, дзе знаходзіцца вельмі моцны кантынгент. Амаль палова (48%) студэнтаў БДУ бюджэтнай формы пры паступленні набралі 300 балаў і больш.

На жаль, сярод тых, хто паступіў ва ўніверсітэт па-за конкурсам, толькі кожны пяты мае дастаткова высокія балы, каб паспяхова ўключыцца ў вучэбны працэс, а большасць ільготнікаў вучыцца не могуць. Для нас заўсёды вялікая праблема, што рабіць з імі пасля першай сесіі, бо па некаторых спецыяльнасцях адлічэнні даходзяць да 15%: пераважна гэта платнікі і льготнікі, якія не выцягваюць праграму. Таму трэба шукаць іншыя формы сацыяльнай падтрымкі льготных катэгорый грамадзян, а залічэнне ва ўніверсітэт варта ажыццяўляць згодна з падрыхтаванасцю абітурыентаў.

**Васіль Бандарык:**

— Сёлета ў БДУІР дзейнічала аўтаматызаваная сістэма залічэння, якая ў недалёкай будучыні плануецца да ўкаранення ва ўсіх ВНУ. Дык вось для нармальнай работы сістэмы ў маштабах усёй краіны неабходна, каб было як мага менш ільгот, а ўмовы залічэння былі аднолькавыя для ўсіх.

Многія абітурыенты і іх бацькі расцэньваюць ільготы асобным катэгорыям, насуперак добрай задуме, як сацыяльную несправядлівасць. Так, сёлета на спецыяльнасць "Маркетынг" прахадны бал быў 299 балаў, а па сельскім конкурсе ва ўніверсітэт прайшоў абітурыент, у якога толькі 160 балаў. Розніца ў балах велізарная, і гэта выклікае ў людзей незадаволенасць.

Падобная сітуацыя назіраецца і ў дачыненні да абітурыентаў, якія маюць права на пазаконкурснае залічэнне. Цяпер многімі выказваецца слушная думка, што прымаць на вучобу трэба згодна з ведамі, а льготы і матэрыяльную падтрымку прадастаўляць ужо падчас вучобы ва ўніверсітэце. Зараз, на жаль, многія льготнікі, якія без іспытаў залічваюцца ва ўніверсітэт, вучацца не вельмі добра, значную колькасць іх даводзіцца адлічваць з універсітэта. Атрымліваецца, што яны занялі чужое месца, але і самі не змаглі ім скарыстацца.

## Ці патрэбны льготы алімпіяднікам?

**Вячаслаў Малафееў:**

— Адным з галоўных паказчыкаў якасці прыёму ва ўніверсітэт з'яўляецца колькасць пераможцаў рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, залічаных без уступных іспытаў. Сёлета такіх 120 чалавек, і мы вельмі рады гэтай колькасці, бо падчас вучобы алімпіяднікі дэманструюць самую лепшую паспяховасць.

Адзіная пазіцыя, на якой мы пастаянна засяроджваем увагу і якая, на жаль, застаецца нязменнай, — алімпіяда па грамадазнаўстве. Штогод яна дае вялікую колькасць пераможцаў, якія маюць права быць залічанымі без уступных іспытаў, і гэта істотна ўплывае на прыём па шэрагу спецыяльнасцей. Таму мы лічым, што алімпіяда па грамадазнаўстве патрабуе перагляду. Вядома, яе трэба праводзіць і вызначаць пераможцаў, але было б лепш, каб яны атрымлівалі як бонус за перамогу 100 балаў па грамадазнаўстве, а не паступленне ва ўніверсітэт. Трэба даць шанс і іншым абітурыентам.

Пры гэтым варта захаваць ільготы пераможцам рэспубліканскіх алімпіяд прыродазнаўчанавуковага блока, бо яны завязаны на міжнародных алімпіядах і заданні там фарміруюцца міжнароднага ўзроўню. Больш за тое, мы не супраць, каб пераможцы абласнога тура таксама паступалі ў ВНУ без уступных іспытаў, бо і яны маюць вельмі высокі ўзровень.

Канечне, усе алімпіяднікі добра падрыхтаваны, маюць добрыя атэстаты, і яны паступілі б ва ўніверсітэт па агульным конкурсе. Але трэба разумець, што многія пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд удзельнічаюць у міжнародных алімпіядах і іншых інтэлектуальных спаборніцтвах, і які сэнс у тым, каб адцягваць іх час на падрыхтоўку да ЦТ? Сваімі вынікамі яны ўжо даказалі права быць студэнтамі ўніверсітэта.

**Віктар Шадурскі, дэкан факультэта міжнародных адносін БДУ:**

— Зразумела, што пераможцы алімпіяды — гэта адны з лепшых абітурыентаў, якія праявілі сябе ў нацыянальным маштабе. Але алімпіяда па грамадазнаўстве кожны год уносіць карэктывы ў прыём на спецыяльнасці нашага факультэта "Міжнароднае права", "Міжнародныя адносіны" і "Лінгвакраіназнаўства". Наборы на гэтыя спецыяльнасці невялікія — 10—15 чалавек, а пераможцаў алімпіяды па грамадазнаўстве, якія маюць права паступаць да нас без уступных іспытаў, сёлета было 21. Гіпатэтычна можа ўзнікнуць такая сітуацыя, калі на адной з названых спецыяльнасцей можа ўтварыцца конкурс толькі сярод пераможцаў алімпіяды. У гэтым годзе, напрыклад, на "Міжнародным праве" ў асноўным з-за пераможцаў алімпіяд на конкурс засталося толькі 4 з 15 месцаў. Прахадны бал склаў 369. Адпаведна, не змаглі паступіць на бюджэтную форму абітурыенты з вельмі высокімі баламі, якія мэтанакіравана рыхтаваліся і, магчыма, марылі працаваць у сферы міжнародных адносін. Усё гэта вельмі драматычна.

Яшчэ раз падкрэслю, што колькасць бюджэтных месцаў на спецыяльнасцях нашага факультэта, дзе профільным прадметам з'яўляецца грамадазнаўства, вельмі абмежаваная. Таму 21 пераможца алімпіяды, на мой погляд, — гэта многа. Дарэчы, вельмі абмежаваны выбар і ў абітурыентаў, якія паступаюць на ФМА праз цэнтралізаванае тэсціраванне на спецыяльнасці, дзе патрабуецца набор сертыфікатаў па дзяржаўнай мове, замежнай мове і грамадазнаўстве. Такі пералік прадметаў не пакідае ім выбару: абітурыент, які не прайшоў на "Міжнароднае права" па конкурсе, скажам, з балам 368, у Мінску амаль не мае варыянтаў паступлення на бюджэт. Тым мацней драматызм сітуацыі.

Акрамя таго, грамадазнаўства — своеасаблівы прадмет. Ён адносна невялікі па аб'ёме, і школьнікам лягчэй па ім падрыхтавацца, чым, напрыклад, па гісторыі, дзе патрабуецца веданне вялікага аб'ёму матэрыялу. Дарэчы, на факультэце менавіта гісторыю хацелі б бачыць профільным прадметам.

Зараз у нас абмяркоўваецца, ці мэтазгодна, што профільным з'яўляецца грамадазнаўства. На факультэце міжнародных адносін, акрамя падрыхтоўкі па грамадазнаўстве, вельмі важны і іншы кампанент — замежныя мовы. Нашы студэнты вывучаюць па дзве замежныя мовы, прычым адна з іх можа быць экзатычнай, а схільнасць да грамадскіх навук неабавязкова супадае са здольнасцямі да вывучэння моў. На жаль, у нашай практыцы ёсць выпадак, калі студэнтка, якая паступіла без экзаменаў як пераможца алімпіяды, потым была адлічана з-за непаспяховасці па замежнай мове. Таму для факультэта важна, каб пры паступленні абітурыенты маглі прадэманстраваць узровень валодання замежнай мовай. З гэтага пункта гледжання ўладальнікі сертыфікатаў ЦТ з высокімі баламі маюць перавагу ў параўнанні з пераможцамі алімпіяды па грамадазнаўстве.

Але галоўнае пры адборы, на мой погляд, — гэта не перамога абітурыента ў алімпіядзе і не найвышэйшыя балы на ЦТ, а рэалістычныя ўяўленні аб будучай сферы дзейнасці. Міжнародныя адносіны — гэта работа не толькі за мяжой, аб чым многія мараць, а часцей за ўсё на прадпрыемствах і ў арганізацыях нашай краіны, у тым ліку і ў рэгіёнах.

**Сяргей Барвенаў:**

— Я за тое, каб усе ўдзельнікі рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд мелі права атрымаць 100 балаў па адпаведным прадмеце, а вось рашэнне, ці залічаць іх без экзаменаў, павінны прымаць самі ВНУ. Многія з радасцю прымуць пераможцаў алімпіяд без усялякіх экзаменаў. Вядучыя ж універсітэты Беларусі, магчыма, захочуць правесці яшчэ і дадатковы адбор.



**Віктар Шадурскі:** *"Алімпіяда па грамадазнаўстве кожны раз стварае драматычныя сітуацыі для абітурыентаў з вельмі высокімі баламі".*



**Юрый Быкадараў:** *"Калі з дзвюх бед выбіраць адну, то ўсё ж лепш недабраць, чым дабраць тых, у каго 1-2 балы па профільным прадмеце".*

# станоўчы бал пры паступленні ў ВНУ?

**Ужо трэці год Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў і Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі праводзяць залічэнне па новых правілах, якія дазваляюць прымаць на вучобу найбольш таленавітых абітурыентаў — істотную вагу (75%) у фарміраванні прахаднога бала маюць творчыя іспыты. Конкурс ажыццяўляецца на аснове агульнай сумы наступных адзнак: балы за кожны этап уступнага іспыту па прадмеце "Творчасць" плюс сярэдні бал, атрыманы пры складанні балаў за цэнтралізаванае тэсціраванне і сярэдняй адзнакі дакумента аб адукацыі. Такім чынам, улічваюцца ўсе балы, атрыманыя на іспытах па творчых прадметах, а па агульнаадукацыйных — толькі агульны сярэдні бал. Гэта дае перавагу пры паступленні творча адораным маладым людзям. Адметна, што апошнім часам вельмі часта гучаць прапановы пашырыць гэты вопыт і на іншыя ВНУ, дзе ёсць уступны экзамен па творчасці, каб даць дарогу самым таленавітым абітурыентам. Але калі да мастакоў і музыкаў прэтэнзій няма, то ў дачыненні да адбору будучых журналістаў ці архітэктараў ёсць пытанні, бо матэматыка для архітэктара ці мова для журналіста не менш важныя, чым наяўнасць творчых здольнасцей да гэтых прафесій. Таму пытанні застаюцца...**

## Ці паўплывала новая сістэма прыёму на агульную пісьменнасць студэнтаў?

**Лідзія Бярозкіна, прарэктар па вучэбнай рабоце Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў:**

— Асаблівасць нашай ВНУ заключаецца ў тым, што мы павінны вучыць студэнтаў творчым прафесіям, а таму мы доўга змагаліся за права надаць большую вагу творчым здольнасцям абітурыентаў. Гэта апраўдана, бо сам экзамен "Творчасць" доўжыцца ў нас 10 дзён і дае магчымасць раскрыцца кожнаму ўдзельніку. Ён праходзіць у тры этапы, кожны з якіх ацэньваецца асобна па дзесяцібальнай сістэме. Такім чынам, максімальная сумарная адзнака на экзамене "Творчасць" у нас складае не 10 балаў, як у іншых ВНУ, а 30.

Асноўная задача такога падыходу заключаецца ў тым, каб творчыя здольнасці абітурыентаў мелі перавагу перад іншымі паказчыкамі. Вядома, мы таксама хочам прымаць на вучобу пісьменных студэнтаў, якія добра валодаюць мовай, ведаюць гісторыю Беларусі і ўвогуле маюць добры бал у атэстаце. Але трэба разумець, што ўсебакова адораных людзей вельмі мала, і насамрэч выключна рэдкія выпадкі, калі мастакі ці музыканты гэтак жа лёгка, як мастацтва, спасцігаюць фізіку, хімію, біялогію... Часта мы назіраем якраз адваротную прапорцыю: чым лепш чалавек здае творчыя іспыты, тым ніжэйшы бал у яго атэстаце. Такія вось творчыя людзі (хаця, вядома, бываюць і выключэнні!).

Менавіта таму мы заўсёды адчувалі вялікую крыўду за тых людзей, якія атрымлівалі высокія адзнакі на экзамене "Творчасць", але з-за недахопу балаў па агульнаадукацыйных прадметах або ўвогуле не праходзілі ў акадэмію, або паступалі на ўмовах аплаты. У той жа час іх месцы нярэдка займалі маладыя людзі, якія добра здалі ЦТ і мелі добры атэстат, хаця на экзамене "Творчасць" атрымалі сярэдненькія адзнакі. Часта ўжо на першым творчым праглядзе можна было назіраць высокі мастацкі ўзровень платнікаў і даволі пасрэдны — бюджэтнікаў. Хаця па логіцы павінна было быць усё наадварот: у творчай ВНУ прывілеі павінны належаць таленавітым людзям.

На шчасце, тры гады назад сітуацыя выправілася, і, аналізуючы вынікі прыёму гэтых трох апошніх гадоў, мы бачым, што ў акадэмію сталі прыходзіць больш падрыхтаваныя людзі, чым пры папярэдніх умовах прыёму. Адметна, што абітурыенты, якія былі мацнейшымі пры правядзенні іспыту "Творчасць", з'яўляюцца потым мацнейшымі студэнтамі ў групе, а таму і сацыяльных канфліктаў не ўзнікае, як у мінулыя гады.

Хаця, канечне, ёсць праблемы з пазаконкурсным залічэннем ільготных катэгорый грамадзян. Так, мы згодны, што шэрагу людзей трэба дапамагаць, але прыём па-за конкурсам у творчую ВНУ не зусім апраўданы, бо людзі, якія паступілі ў акадэмію не па сваім таленце, а дзякуючы льготам, не могуць вучыцца побач са сваімі таленавітымі аднакурснікамі.

Многія цікавяцца, ці паўплывала новая сістэма прыёму ў творчыя ВНУ на агульную пісьменнасць студэнтаў. Так, вага адзнак, атрыманых абітурыентамі па агульнаадукацыйных прадметах, складае ўсяго 25% ад прахаднога бала ў акадэмію, але пры гэтым нельга сказаць, што ў апошнія гады да нас сталі прыходзіць менш пісьменныя людзі. Дакладней, наадварот: і ў папярэднія гады моўная пісьменнасць у многіх абітурыентаў кульгала, таму пагаршэння яе ўзроўню мы не заўважылі.

Зрэшты, мовам і гісторыі Беларусі мы можам навучыць і ў акадэміі, а вось таленту навучыць нельга: ён або ёсць, або яго няма. І мы тут не выкладаем творчасць, а толькі развіваем тыя прыродныя здольнасці, якія закладзены ў людзях.

## Ці зацікаўлены іншыя ВНУ працягнуць эксперымент?

**Армен Сардараў, дэкан архітэктурнага факультэта Беларускага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта:**

— Сістэма падліку адзнак, якая зараз прымяняецца ў адносінах да абітурыентаў архітэктурнага факультэта, мяне задавальняе. Творчы іспыт мае тры складнікі: малюнак, кампазіцыя і чарчэнне (на спецыяльнасці "Архітэктура") альбо малюнак, кампазіцыя і жывапіс (на спецыяльнасці "Архітэктурны дызайн"). Кожны са складнікаў ацэньваецца асобна, такім чынам, абітурыент атрымлівае тры адзнакі за творчы іспыт. Яшчэ тры адзнакі — гэта балы, атрыманыя на цэнтралізаваным тэсціраванні па матэматыцы і мове, а таксама сярэдні бал сертыфіката. Такім чынам, агульны бал абітурыента ўяўляе сабой сярэдняе арыфметычнае шасці адзнак.

Такую сістэму ў свой час прыйшлося адстойваць, таму што некалі "вага" менавіта творчага экзамену складала ўсяго 25%, паколькі за тры яго складнікі выводзілася адна агульная адзнака. Лічу, што мы знайшлі аптымальны баланс паміж "вагой" экзамену па прадмеце "Творчасць" і "вагой" сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання і сярэдняга бала атэстата — 50×50. Але я супраць таго, каб на архітэктурным факультэце і далей мяняць гэты баланс на карысць прадмета "Творчасць". Хацелася б, каб да нас паступалі ўсебакова развітыя маладыя людзі, якія на дастойным узроўні валодаюць мовай, а тым больш матэматыкай, паколькі архітэктурная адукацыя мае на ўвазе і істотны інжынерны складнік.

**Святлана Майсяйчук, намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:**

— Для нашага ўніверсітэта надзвычай актуальная тая ініцыятыва, з якой выступіў у гэтым годзе старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у ВНУ і ССНУ акадэмік Анатоль Рубінаў, аб далучэнні іншых ВНУ, дзе ёсць творчыя спецыяльнасці, да такой жа сістэмы падліку балаў абітурыентаў, якая ў апошнія гады выкарыстоўвалася ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Па-першае, таму што ў БДУКіМ 12 з 16 спецыяльнасцей і 25 з 41 напрамкаў прадугледжваюць экзамен па прадмеце "Творчасць". А па-другое, у нас ёсць такія спецыяльнасці (напрыклад, усе спецыяльнасці факультэта музычнага мастацтва), дзе абітурыентамі з'яўляюцца толькі выпускнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. У музычных вучылішчах, каледжах мастацтваў асноўная ўвага ўдзяляецца падрыхтоўцы да будучай спецыяльнасці, а не па агульнаадукацыйных прадметах, і тым больш не да здачы цэнтралізаванага тэсціравання. Па гэтай прычыне выпускнікі ССНУ, якія найбольш прафесійна падрыхтаваныя і творча адораныя, могуць паказваць адносна невысокія вынікі па прадметах тэсціравання. Існуючая сістэма падліку балаў не дазваляе гэтай катэгорыі абітурыентаў набраць неабходную колькасць прахадных балаў.

Аналізуючы вынікі ўступнай кампаніі, прыёмная камісія адзначае кожны выпадак, дзе ўніверсітэт губляе творча адораных маладых людзей, месца якіх займаюць абітурыенты, што паказалі адносна невысокі ці сярэдні ўзровень творчасці, але высокі ўзровень агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі. Магу праілюстраваць гэта на тыповым прыкладзе. Абітурыент А., які паступае на напрамак спецыяльнасці "Рэжысура свят", атрымлівае па ўсіх трох творчых іспытах па 9 балаў, але ЦТ і дакумент аб адукацыі даюць яму толькі 14 балаў. Другі абітурыент, назавём яго В., здаў творчыя іспыты на 7, 7, 6, затое астатнія адзнакі ў суме далі яму 21,5 бала. У выніку залічаны абітурыент В., а А. не праходзіць па конкурсе. Элементарныя разлікі паказваюць, што пры той сістэме, якая зараз прымяняецца ў акадэміі мастацтваў і ў акадэміі музыкі і якую мы хацелі б выкарыстоўваць у БДУКіМ, студэнтам стаў бы першы абітурыент, які, на наш погляд, гэтага больш заслугоўвае.

Бывалі выпадкі, што не праходзілі па конкурсе нават асобы з чырвоным дыпломам ССНУ менавіта з-за таго, што мелі нізкія балы сертыфікатаў па дзяржаўнай мове і гісторыі Беларусі. Прычым не скажаш, што яны сапраўды не ведаюць гэтых прадметаў: проста ў каледжах, паўтару, навучэнцы не трэніруюцца здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне, якое з'яўляецца спецыфічнай формай праверкі ведаў. Зазначу, што студэнты ўсіх факультэтаў і спецыяльнасцей БДУКіМ вывучаюць гісторыю Беларусі на першым курсе, і нават калі нехта нечага недавучыў, то ён дапоўніць свае веды ўжо ва ўніверсітэце. Акрамя таго, гісторыя Беларусі спасцігаецца ў вучэбным працэсе праз знаёмства з музычнымі творамі айчынных аўтараў, праз пастаноўку твораў беларускіх драматургаў. Мова таксама вывучаецца ва ўніверсітэце. Тым не менш звыш 60% вучэбнага плана складаюць усё ж дысцыпліны спецыяльнасці і спецыялізацыі. Нездарма ў апошні час у нас зарэгістравана некалькі выпадкаў, калі з творчых спецыяльнасцей студэнты пераводзяцца на "Менеджмент": яны не дацягваюць у дысцыплінах спецыялізацыі. Талент перш за ўсё! Астатняму навучым.

## Ці патрэбен відэазапіс падчас творчага экзамену?

**Святлана Майсяйчук:**

— Ужо некалькі гадоў запар у нашым універсітэце не было апеляцый. Гэта, на мой погляд, з'яўляецца пацвярджэннем таго, што экзамены ацэньваюцца аб'ектыўна. Экзаменацыйныя камісіі БДУКіМ, лічу, былі б не супраць такога новаўвядзення, як відэазапіс падчас экзаменаў, але папярэдне павінны сказаць сваё слова псіхолагі: ці не будзе перашкаджаць камера самім экзаменуемым і ці не паўплывае адмоўна на адзнаку?

**Матэрыял падрыхтавалі Галіна СІДАРОВІЧ**
*sidarovich@nastgaz.by*
**і Іна НІКІЦЕНКА.**
*nikitsenka@nastgaz.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**



**Лідзія Бярозкіна:** *"Творчыя здольнасці абітурыентаў павінны мець перавагу перад іншымі паказчыкамі".*



**Святлана Майсяйчук:** *"Талент перш за ўсё! Астатняму навучым".*



**Армен Сардараў:** *"50×50 — аптымальны баланс паміж "вагой" творчага экзамену і "вагой" агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі абітурыента".*

***Упершыню ў гісторыі Акадэміі МУС такое права атрымаў Сяргей Краўчук дзякуючы таму, што стаў пераможцам рэспубліканскай алімпіяды па грамадазнаўстве. Але да гэтага хлопец прайшоў сур'ёзнае медыцынскае абследаванне. Увогуле, як адзначаюць у Акадэміі МУС, калі б да іх у ВНУ маглі паступаць школьнікі са звычайнымі медыцынскімі даведкамі, то конкурс быў бы ў шмат разоў вышэйшы. Але і на гэты час конкурс у акадэмію сярод хлопцаў складае каля 3 чалавек на месца, а сярод дзяўчат увогуле каля 45! Таму акадэмія можа выбіраць сабе не толькі фізічна і псіхічна здаровых людзей, а сапраўдных інтэлектуалаў, таленавітых у розных галінах.***
***Пра выніκі ўступнай кампаніі, асаблівасці паступлення і навучання ў акадэміі мы размаўляем з Анатолем Леанідавічам Савянком, першым намеснікам начальніка Акадэміі МУС, кандыдатам юрыдычных навук, дацэнтам, палкоўнікам міліцыі.***

# У Акадэмію МУС без уступных выпрабаванняў

***— У горадзе (Мінску) на бігбордах можна пабачыць фотаздымак прыгожай дзяўчыны ў міліцэйскай форме і подпіс да яго "Калі табе ўласцівы адвага і гонар, то ты патрэбен тут". Гэта ваша курсантка? Адвага і гонар — асноўныя якасці, якімі павінны валодаць маладыя людзі, што жадаюць працаваць у органах аховы правапарадку?***

— Так, гэта наша сёлетняя выпускніца. Гэты бігборд падрыхтавала Міністэрства ўнутраных спраў.

На маю думку, адвага і гонар — якасці, якімі павінен валодаць кожны чалавек, а таксама той, хто выбірае нашу ВНУ, а значыць, і прафесію супрацоўніка органаў унутраных спраў.

Сёння супрацоўнік міліцыі — гэта не толькі той, хто змагаецца са злачыннасцю, а яшчэ псіхолаг, педагог, сацыяльны работнік, але са сваёй спецыфікай. Міліцыя прыязджае на месца здарэння ў ліку першых, таму яе супрацоўнікі не павінны быць чэрствымі ў адносінах да чужога гора і павінны ўмець суперажываць. Акрамя абавязкаў па раскрыцці і расследаванні правапарушэнняў, супрацоўнікі міліцыі абавязаны штодня, выходзячы на службу, аказваць грамадзянам дапамогу самага рознага характару. Сёння ўдзяляецца вялікая ўвага рабоце па папярэджанні правапарушэнняў у маладзёжным асяроддзі. Лічу, што ў гэтым сэнсе мы са школамі робім агульную справу, таму наша ўзаемадзеянне павінна быць больш плённым.

У акадэміі побач з дысцыплінамі, якія традыцыйна вывучаюцца ў юрыдычных ВНУ, мы вялікую ўвагу ўдзяляем пытанням педагогікі, псіхалогіі. Распрацаваны спецыяльныя курсы па наладжванні зносін з грамадзянамі, СМІ, расказваем пра тое, як правесці гутарку ў калектыве і г.д.

***— Хто ў гэтым годзе прыйшоў вучыцца ў вашу акадэмію? Ці задаволены вы сёлетняй уступнай кампаніяй?***

— Вядома, заўсёды хочацца яшчэ лепшага. З году ў год мы самі сабе ўзнімаем планку. Сёлета мы цалкам задаволены нашымі нававбранцамі.

Колькасць жадаючых атрымаць адукацыю ў сценах нашай акадэміі стабільна высокая. І сёлета таксама колькасць абітурыентаў значна перавышала колькасць месцаў. Самы высокі конкурс быў на спецыяльнасць следча-экспертнага факультэта "Правазнаўства", які складаў 4,36 заявы на месца. Самы высокі прахадны бал набрала курсантка Інга Пятровіч — 373. Упершыню ў гісторыі нашай ВНУ на спецыяльнасць "Эканамічнае права" без уступных выпрабаванняў як пераможца рэспубліканскай алімпіяды па грамадазнаўстве быў залічаны Сяргей Краўчук.

Усе 450 маладых людзей, якія сёлета надзелі форму курсантаў нашай акадэміі, годна прайшлі вучэбна-палявыя зборы, якія звычайна праводзяцца ў жніўні, і засталіся верныя свайму жаданню стаць афіцэрамі МУС.

***— Заняткі ў Акадэміі МУС пачынаюцца ў жніўні? Вучэбна-палявыя зборы — гэта накшталт уводзін у будучую прафесію?***

— Так, мы пачынаем заняткі раней за іншыя ВНУ. Вучэбна-палявыя зборы — гэта сапраўды своеасаблівая адаптацыя да спецыфікі навучання ў акадэміі. Тры тыдні нашы курсанты ў жніўні наведвалі заняткі па прафесійнай, агнявой і прафесійна-прыкладной фізічнай падрыхтоўцы. А ў канцы жніўня яны прымалі прысягу.

Наш курсант, з аднаго боку, нібыта студэнт, паколькі ён атрымлівае вышэйшую юрыдычную адукацыю, разам з тым



ён яшчэ і супрацоўнік міліцыі. Падчас збораў ён павінен адчуць сябе і ў адной, і ў другой ролі. Таму вучэбна-палявыя зборы, безумоўна, накіраваны ў першую чаргу на адаптацыю да нашых спецыфічных умоў.

Яшчэ раз адзначу, што мы задаволены маладымі людзьмі, якія да нас паступілі. Я перакананы, што праз пяць гадоў яны атрымаюць дыпломы і стануць годнымі афіцэрамі, якія з улікам сучасных інфармацыйных тэхналогій будуць больш эфектыўна змагацца са злачыннасцю і ўзаемадзейнічаць з грамадзянамі.

***— Анатоль Леанідавіч, ці былі ў вас выпадкі, калі маладыя людзі пасля вучэбна-палявых збораў расчараваліся з марай стаць міліцыянерамі і забіралі дакументы з акадэміі?***

— Такія адзінкавыя выпадкі здараліся, безумоўна. Паколькі не ўсе ўяўляюць, як адбываецца навучанне ў акадэміі. Але гэта, падкрэсліваю, адзінкавыя выпадкі. Мы праводзім вялікую прафарыентацыйную работу. Сёння мы ўзаемадзейнічаем больш чым са 100 юрыдычнымі класамі ў 63 школах рэспублікі.

Мы пастаянна праводзім анкетаванне сярод тых, хто да нас паступае. Дык вось, большасць апытаных адзначылі, што яны паступілі ў Акадэмію МУС для таго, каб займацца працай, якая адпавядае іх схільнасцям і жаданням, каб дапамагаць людзям. Вядома, не апошнюю ролю адыгрываюць і матэрыяльныя стымулы нававбранцаў. Трэцяя частка ўказала, што ў будучым яны жадаюць атрымліваць стабільны заробак, быць матэрыяльна забяспечанымі і абароненымі, і столькі ж чалавек лічаць, што для іх важна атрымаць спецыяльныя веды і статус чалавека з вышэйшай адукацыяй. Цікавы і той факт, што сярод курсантаў нямала тых, хто перакананы, што служба ў міліцыі дазволіць ім развіць свой асабісты і творчы патэнцыял.

Мы рады, калі да нас паступаюць маладыя людзі, бацькі альбо родныя якіх ужо працуюць у органах унутраных спраў. Як правіла, яны ўжо знаёмы са спецыфікай службы, таму адказна ставяцца да навучання, а затым старанна і адданна служаць, працягваюць сямейныя традыцыі.

***— А ў Акадэмію МУС ахвотна прымаюць дзяўчат?***

— У Акадэмію МУС мы штогод прымаем пэўную колькасць дзяўчат. Кантрольныя лічбы нам устанаўлівае Міністэрства ўнутраных спраў у залежнасці ад таго, якую патрэбу органы ўнутраных спраў маюць у асобах жаночага полу. Жанчыны выдатна сябе зарэкамендавалі на рабоце ў інспекцыі па справах непаўналетніх, у следчых падраздзяленнях.

Хачу адзначыць, што конкурс у акадэмію сярод дзяўчат вельмі высокі. Сёлета мы набралі 6 дзяўчат і конкурс сярод іх складаў прыкладна 45 чалавек на месца. Таму нядзіўна, што мы набіраем асоб жаночага полу толькі з самымі высокімі баламі. Я вышэй ужо называў Інгу Пятровіч, прахадны бал якой складаў 373. Дзяўчына, дарэчы, скончыла школу з залатым медалём. І ў астатніх нашых курсантак балы вышэй за 300.

Калі мы сталі прымаць дзяўчат у акадэмію, то зрабілі для іх рамонт у інтэрнаце, каб ім было камфортна. Але я не скажу, што іх умовы асабліва адрозніваюцца ад тых, дзе пражываюць хлопцы.

Мы за гендарную роўнасць. Калі нас некаторыя папракаюць у тым, што мы абмяжоўваем колькасць дзяўчат у некаторыя падраздзяленні (на аператыўную работу, у прыватнасці), мы адзначаем, што гэта не абмежаванне правоў жанчын, а наадварот, клопат пра іх.

***— Анатоль Леанідавіч, ці могуць вашы курсанты перавесціся ў грамадзянскую ВНУ па сваёй спецыяльнасці? Ці былі такія выпадкі?***

— Калі нехта з нашых курсантаў пажадае пакінуць вучобу ў Акадэміі МУС, то ён, безумоўна, можа працягнуць навучанне ў любой ВНУ па сваёй спецыяльнасці, калі там будзе месца. Тут абмежаванняў няма. Але пры паступленні ў акадэмію мы з кожным курсантам заключаем кантракт, па якім ён абавязаны адвучыцца ў акадэміі пяць гадоў і столькі ж адпрацаваць затым у органах унутраных спраў.

Калі курсант, напрыклад, адвучыўся ў акадэміі некалькі гадоў і збіраецца пакінуць службу, то ён павінен кампенсаваць у поўным аб'ёме грашовыя сродкі, патрачаныя на яго навучанне. А гэта сума вельмі значная, бо сюды ўваходзяць не толькі сродкі за навучанне, але і за пражыванне, харчаванне, абмундзіраванне.

Мяркуем, што тыя, хто да нас паступае, перакананы ў сваім выбары. Таму такія выпадкі здараюцца вельмі рэдка.

Наша адукацыя карыстаецца попытам у моладзі. Таму пасля пэўнага перапынку ў гэтым годзе мы вырашылі адкрыць платную форму агульнай адукацыі (пакуль толькі завочна), і жадаючых было вельмі шмат. На платнае навучанне конкурс быў таксама вялікі, і мы набралі 400 чалавек дадаткова.

***— Як я зразумела, студэнцкае жыццё вашых курсантаў адрозніваецца ад студэнцкага жыцця іншых студэнтаў ВНУ. У вас навучальны год пачынаецца раней на месяц, вашы курсанты пражываюць у казармах, носяць форму... Што яшчэ?***

— Што тычыцца заняткаў, то нашы курсанты займаюцца па тых жа праграмах, што і, напрыклад, студэнты БДУ па спецыяльнасці "Правазнаўства". Мы толькі дадаткова ўводзім дысцыпліны, якія адлюстроўваюць нашу спецыфіку.

Што тычыцца студэнцкага жыцця, то ў нас ёсць спецыфіка. Пад'ём у 6.30, затым снеданне, заняткі, абед, час для самастойных заняткаў, вячэра, адбой у 22.00. Курсанты першага курса ў нас усе ў абавязковым парадку жывуць у казармах акадэміі. Пасля залічэння ў Акадэмію МУС нашы курсанты становяцца супрацоўнікамі міліцыі, таму яны атрымліваюць грашовае ўтрыманне і забяспечваюцца бясплатным харчаваннем і абмундзіраваннем у адпаведнасці з заканадаўствам. Для грамадзян чалавек у пагонах — гэта абаронца, таму мы вучым нашых першакурснікаў, як паводзіць сябе ў самых розных сітуацыях. Пачынаючы з другога курса курсанты, якія паспяхова вучацца і маюць магчымасць пражываць у Мінску, могуць жыць у горадзе.

Нашы курсанты жывуць паўнацэнным жыццём. Яны наведваюць тэатры, кіно, вандруюць па Беларусі — і тут мы ім аказваем дапамогу з транспартам. Шмат ладзім цікавых мерапрыемстваў у сябе ў акадэміі. Не так даўно нашы першакурснікі сустракаліся з акцёрам Уладзімірам Гасцюхіным, з удзельнікамі вакальнай групы "Чысты голас", з алімпійскім чэмпіёнам Аляксандрам Мядзведзем.

***— Анатоль Леанідавіч, раскажыце, калі ласка, тым хлопцам і дзяўчатам, якія мараць атрымаць прафесію міліцыянера ў вашых сценах, як стаць вашымі курсантамі?***

— Для таго каб паступіць у нашу акадэмію, неабходна звярнуцца ў раённы аддзел унутраных спраў да 15 красавіка па месцы жыхарства з заявай. Парадак на наступны год яшчэ не зацверджаны, але тут у нас, як правіла, нічога не мяняецца. Школьнік праходзіць стажыроўку ў органах унутраных спраў, падчас якой яму расказваюць пра характар службы. На месцы ён павінен прайсці адпаведную сур'ёзную медыцынскую праверку. Затым таксама праводзіцца пэўная праверка органамі ўнутраных спраў у адпаведнасці з заканадаўствам яго і яго родных. Толькі пасля гэтага афармляецца асабістая справа на школьніка і прымаецца рашэнне аб накіраванні яго асабістай справы да нас у акадэмію. Пасля гэтага да нас прыбываюць абітурыенты, мы разлічваем папярэдні прахадны бал, і тыя, хто можа да нас паступіць, праходзяць яшчэ адну медыцынскую камісію. Наш курсант павінен быць здаровым чалавекам, бо мы яго прымаем на службу ў органы ўнутраных спраў як мінімум на 20 гадоў. Заўважу, што калі б да нас паступалі тыя, хто па стане здароўя праходзіць як звычайны студэнт, то конкурсы ў нашу акадэмію былі б вышэйшыя.

Пасля нашай медыцынскай камісіі мы вызначаем канчатковы прахадны бал і праводзім залічэнне.

Мы адносімся да ВНУ першага патоку, і калі хто-небудзь да нас не паступае, то мае магчымасць падаць дакументы ў іншую ВНУ.

Я ўжо казаў, што мы праводзім вялікую прафарыентацыйную работу і пачынаем яе з кастрычніка. Кожны год праводзім двойчы дні адкрытых дзвярэй у акадэміі, а яшчэ дадаткова выязджаем у кожную вобласць.

Сёння мы імкнёмся нарасціць узаемадзеянне са школамі. І не толькі таму, што жадаем убачыць сярод сваіх курсантаў самых лепшых выпускнікоў школы, для нас таксама важна, што дзеці, з якімі мы працавалі, хоць і не сталі нашымі курсантамі, але не будуць здзяйсняць процiпраўных учынкаў.

Усім маладым людзям, якія жадаюць стаць супрацоўнікамі ўнутраных спраў, мы раім грунтоўна падумаць, больш даведацца пра спецыфіку прафесіі міліцыянера, а таксама добра вучыцца і займацца спортам.

***— Дзякуй, Анатоль Леанідавіч, за інтэрв'ю.***

**Гутарыла Святлана КІРСАНАВА.**
*kirsanava@nastgaz.by*

# Юрыстаў многа не бывае



Ніна Урублеўская са студэнтамі Юрыдычнага каледжа БДУ.

***Днямі да нас у рэдакцыю патэлефанавала жанчына, маці дзяўчынкі-дзевяцікласніцы. "Магчыма, не па адрасе звяртаюся, але ж спадзяюся, што хоць нейкую кансультацыю вы мне дадзіце. Мая дачка збіраецца паступаць у наступным годзе ў Юрыдычны каледж БДУ. Я спрабую адгаварыць яе, бо юрыстаў, як кажуць усе мае знаёмыя, у нас і так шмат. А дзе потым работу знайсці? Ці праўда, што юрысты і эканамісты сёння нікому не патрэбны і марнаваць час на атрыманне гэтых спецыяльнасцей не варта?"***
***У паўнамоцтвы супрацоўнікаў рэдакцыі не ўваходзяць адказы на такія пытанні, аднак мы вырашылі дапамагчы нашай чытачцы і звярнуліся непасрэдна ў Юрыдычны каледж Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.***

— У выпускнікоў нашай навучальнай установы не бывае праблем з працаўладкаваннем, — запэўніла нас намеснік дырэктара каледжа па вытворчым навучанні кандыдат юрыдычных навук Ніна Генадзьеўна Урублеўская. — У мінулым годзе, напрыклад, мы размеркавалі 95% выпускнікоў бюджэтнай формы навучання (акрамя тых маладых людзей, якія маюць права на свабоднае размеркаванне па сацыяльных прычынах (дзеці-сіроты і дзеці, што засталіся без папячэння бацькоў, дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў, інваліды І і ІІ групы і г.д.), сёлета — 100%. Выпускнікі, якія вучыліся на платнай аснове, шукаюць работу самі. Безумоўна, калі яны сутыкаюцца са складанасцямі, а ў нас застаюцца вакантныя месцы пасля размеркавання бюджэтнікаў альбо прыходзяць дадатковыя запыты ад наймальнікаў, то мы абавязкова садзейнічаем ім у працаўладкаванні. На сёння такіх выпускнікоў, якія не змаглі працаўладкавацца, няма.

Асноўным заказчыкам кадраў для Юрыдычнага каледжа БДУ выступае Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь. У першую чаргу тут рыхтуюць сакратароў судовых пасяджэнняў, судовых выканаўцаў, а таксама юрысконсультаў і спецыялістаў кадравых службаў, якія заўсёды запатрабаваны на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях розных форм уласнасці.

— Напрыклад, сёлета адзін з нашых выпускнікоў быў накіраваны на работу ў аддзел адукацыі Уздзенскага райвыканкама, — паведаміла Н.Г.Урублеўская. — Заяўкі на юрыстаў паступаюць і ад прадпрыемстваў сельскагаспадарчага профілю Гродзенскай, Гомельскай абласцей. Другі раз запар запыт на нашых выпускнікоў робіць Карэліцкая раённая бальніца. Заўважу, што кожны год каледж атрымлівае пісьмы з падзякай у адрас сваіх выпускнікоў ад кіраўнікоў тых арганізацый, дзе яны праходзілі практыку.

Такім чынам, запатрабаванасць у юрыстах застаецца, ды і жадаючых атрымаць спецыяльнасць "Правазнаўства" ў названым каледжы больш чым дастаткова. Так, у гэтым годзе конкурс сярод абітурыентаў, якія паступалі на дзённую бюджэтную форму навучання на аснове базавай адукацыі, склаў 6 чалавек на месца (у 2010 годзе — 8 чалавек на месца). Сярод тых, хто паступаў на аснове сярэдняй адукацыі, конкурс склаў 5,2 чалавека на месца (летась — 5,7). Прахадны бал для гарадскіх выпускнікоў базавай школы быў роўны паказчыку 24,6, для жыхароў сельскай мясцовасці — 23,8 (у 2010 годзе — 23,8 і 23,4 бала адпаведна). Прахадны бал для абітурыентаў, якія паступалі на базе сярэдняй адукацыі, быў 208 (летась — 204).

На дзённую платную форму навучання на аснове агульнай базавай адукацыі конкурс склаў 1,3 чалавека на месца, агульны прахадны бал — 17,6 (летась — 19,7). На дзённую платную форму навучання на аснове сярэдняй адукацыі конкурс быў 1,5 чалавека на месца, прахадны бал — 142.

На завочнае аддзяленне таксама быў конкурс: 2 чалавекі на месца на бюджэтную форму навучання (у 2010 годзе — 1,9) і 1,5 — на платную (летась — 1,8).

У выніку на першы год навучання (дзённае і завочнае аддзяленні) сёлета ў Юрыдычны каледж БДУ было залічана 230 чалавек.

Трэба дадаць, што да 2000 года (*год адкрыцця каледжа*. — **Г.Л.**) у Беларусі не было ні адной сярэдняй спецыяльнай установы, якая б мэтанакіравана рыхтавала юрыстаў. У 2003 годзе загадам міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь № 446 Юрыдычны каледж БДУ быў вызначаны як базавая сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова па праблемах прававой адукацыі. З утварэннем названага каледжа стала магчымым фарміраванне адзінай сістэмы бесперапыннай юрыдычнай адукацыі ў краіне: юрыдычны каледж — юрыдычны факультэт БДУ — Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі.

— Нашы выпускнікі маюць права працягваць навучанне па спецыяльнасці на юрыдычным факультэце БДУ са скарочаным тэрмінам навучання (паступаць на 3 курс згаданай ВНУ), — адзначыла наша суразмоўца. — Вышэйшую юрыдычную адукацыю атрымліваюць 90—95% выпускнікоў каледжа, каля 40% з іх займаюцца на дзённай форме навучання.

Акрамя таго, па словах Н.Г.Урублеўскай, навучэнцы каледжа могуць карыстацца вучэбнымі аўдыторыямі і лабараторыямі, спартыўнымі збудаваннямі, бібліятэкамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, паколькі юрыдычны каледж з'яўляецца яго структурным падраздзяленнем. Асноўнымі базамі вучэбнай і пераддыпломнай практыкі з'яўляюцца Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, сістэма агульных судоў, гаспадарчы суд Мінска, раённыя адміністрацыі Мінска і выканаўчыя камітэты раёнаў, суб'екты гаспадарання розных форм уласнасці.

**Выпускнікі Юрыдычнага каледжа БДУ могуць працаўладкавацца ў:**

*юрыдычных (прававых), кадравых, рэферэнцкіх службах органаў выканаўчай улады (міністэрстваў, ведамстваў і іншых органаў дзяржаўнага кіравання) і органаў мясцовага кіравання і самакіравання (сацыяльнай абароны, ліцэнзавання і рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання, статыстыкі і інш.);
*юрыдычных (прававых), кадравых, рэферэнцкіх службах суб'ектаў гаспадарання розных форм уласнасці, грамадскіх арганізацыях, прафсаюзах і інш.);
*органах судовай улады (канцылярыя, статыстыка, архіў, выкананне судовых пастаноў, забеспячэнне судаводства і інш.);
*органах пракуратуры (канцылярыя, статыстыка, архіў і інш.);
*установах юстыцыі (органы ЗАГС, натарыята, адвакатуры, архівы юрыдычных кансультацый і інш.).

**Глафіра ЛЯТКОЎСКАЯ.**
*liatkouskaya@nastgaz.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

# Навучанне ў растэрміноўку

## *Хто і на якіх умовах прадастаўляе такую магчымасць*

***Апошняе павышэнне кошту навучання ў ВНУ зрабіла кашалькі бацькоў студэнтаў значна лягчэйшымі. Цяпер першакурсніку ў залежнасці ад выбранай ім навучальнай установы і факультэта прыйдзецца заплаціць да 7,5 млн рублёў за год. Пажадана, каб ужо пры паступленні абітурыент і яго бацькі цвяроза ацэньвалі сямейны бюджэт і папярэдне планавалі выдаткі на адукацыю, каб не аказацца ў складанай сітуацыі, як гэта здарылася з адным з нашых чытачоў.***

Рэдакцыя "Настаўніцкай газеты" атрымала ліст такога зместу: "Напрыканцы студзеня бягучага года адна з беларускіх газет паведаміла (са слоў міністра адукацыі Сяргея Маскевіча), што ВНУ прадастаўляюць магчымасць студэнтам-платнікам уносіць плацяжы за навучанне ў растэрміноўку. Чаму многія ВНУ гэтага не чуюць? Пракаменціруйце сітуацыю".

Хоць рэдакцыя і не абавязана адказваць на пісьмы без подпісу, але, улічваючы вастрыню праблемы (яна тычыцца вялікай колькасці студэнтаў-платнікаў і іх сем'яў), мы вырашылі разабрацца ў сітуацыі.

Карэспандэнт газеты звярнулася ў шэраг універсітэтаў (іх выбар быў абсалютна выпадковым, паколькі чытач не ўказаў, якія менавіта вышэйшыя навучальныя ўстановы ён мае на ўвазе) з пытаннем, ці прадастаўляюць яны студэнтам платнай формы навучання магчымасць растэрміноўкі плацяжоў. Ва ўсіх установах адукацыі, якія ўдалося ахапіць у межах гэтага невялікага даследавання (у тым ліку ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А.А.Куляшова, Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка), адказ быў станоўчым.

**Нагадаем, што ў гэтым годзе студэнтамі платнай формы навучання сталі звыш 30 тысяч чалавек.**

Прарэктар па вучэбнай рабоце МДУ імя А.А.Куляшова Мікалай Бузук патлумачыў, што ў іх універсітэце права атрымаць растэрміноўку аплаты за навучанне мае студэнт, які знаходзіцца ў цяжкім матэрыяльным становішчы. Для гэтага яму неабходна звярнуцца з адпаведнай заявай на імя рэктара. Дакументы, якія прадастаўляе платнік, разглядаюцца на факультэце і ў рэктараце.

Па словах прарэктара па вучэбнай рабоце БДПУ імя Максіма Танка Юрыя Быкадорава, растэрміноўка плацяжоў уяўляе сабой пэўную цяжкасць для навучальнай установы, таму што большасць сродкаў студэнтаў-платнікаў ідзе на аплату працы прафесарска-выкладчыцкага складу. "Справа ў тым, што мы прымаем выкладчыка на работу як мінімум на семестр. Калі студэнт уносіць аплату памесячна, то невядома, ці заплаціць ён да канца семестра. Як тады аплачваць паслугі выкладчыкаў? — каменціруе Юрый Аляксандравіч. — Але гэта ніяк не ўплывае на прадастаўленне студэнтам магчымасці растэрміноўкі аплаты за навучанне. Калі ёсць такая патрэба, чалавек можа напісаць заяву з адпаведнай просьбай".

**Святлана ВАСІЛЕЎСКАЯ.**

# Уступная кампанія ў ССНУ:
## абітурыентаў шукалі нават ва Украіне і Расіі

**Міністэрства адукацыі падвяло вынікі ўступнай кампаніі ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Аб асаблівасцях прыёму ў ССНУ нашай газеце расказала галоўны інспектар аддзела сярэдняй спецыяльнай адукацыі ўпраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Марына СУВОРАВА.**

***— Марына Эдуардаўна, як паўплываў дэмаграфічны спад на ўступную кампанію ў ССНУ: у вышэйшай школе, як вядома, зарэгістраваны істотныя недаборы на бюджэтныя месцы, а што можна сказаць аб сістэме сярэдняй спецыяльнай адукацыі?***

— Запланаваны бюджэтны набор у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы супастаўляльны з наборам у ВНУ: 28 тысяч супраць 25 тысяч. У цэлым у ССНУ засталіся незапоўненымі каля 400 месцаў на бюджэтнай форме навучання (*у ВНУ — 134. —* **Заўв. аўт.**), ці 1,5% ад запланаванага набору. Нагадаю, што ў 2011 годзе на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі прыём ажыццяўлялі 213 устаноў адукацыі дзяржаўнай формы ўласнасці і 12 устаноў прыватнай формы.

***— Ці карэкціраваліся планы прыёму ў параўнанні з 2010 годам у сувязі з дэмаграфічнай сітуацыяй?***

— Фарміраванне кантрольных лічбаў прыёму ў 2011 годзе ажыццяўлялася згодна з Дзяржаўнай праграмай развіцця сярэдняй спецыяльнай адукацыі на 2011—2015 гады, заявак ад арганізацый — заказчыкаў кадраў, а таксама пад уплывам дэмаграфічнага спаду. У гэты момант заказ на падрыхтоўку кадраў перавысіў магчымыя аб'ёмы прыёму, якія стрымліваюцца недахопам абітурыентаў. У найбліжэйшыя гады такая тэндэнцыя захаваецца.

Між іншым дэмаграфічная сітуацыя, якая склалася ў 2010/2011 навучальным годзе, памяншэнне выпускнікоў агульнаадукацыйных школ, прымусіла ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі ўзмацніць прафарыентацыйную работу і разнастаіць яе формы. Напрыклад, буйны прафарыентацыйны праект быў рэалізаваны разам з Беларускай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй. Прадстаўнікі каледжаў шукалі абітурыентаў не толькі ў рэгіёнах рэспублікі, але і выязджалі ў памежныя зоны — Украіну, Расію.

***— Колькі чалавек у выніку залічана і будзе атрымліваць адукацыю ў ССНУ?***

— Агульны прыём ва ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі склаў 49,8 тысячы чалавек, з іх на бюджэтную форму атрымання адукацыі прынята 26,8 тысячы (53,8%), а на платную — 23 тысячы чалавек (46,2%). Заявы ж падалі на ўсе формы навучання 60,8 тысячы чалавек.

У дзяржаўных установах на дзённай форме навучання конкурс склаў 1,8 заявы на адно бюджэтнае месца, што супадае з аналагічным паказчыкам мінулага года. Пры гэтым сярэдні конкурс на аснове агульнай базавай адукацыі крыху павялічыўся і склаў 1,8 заявы на месца, а конкурс на аснове агульнай сярэдняй адукацыі крыху паменшыўся і склаў 1,9. У выніку на дзённую форму залічаны 33,6 тысячы чалавек, з якіх 23,3 тысячы будуць вучыцца за кошт сродкаў бюджэту, а 10,3 тысячы — на ўмовах аплаты.

На завочную і вячэрнюю форму атрымання адукацыі ў дзяржаўныя ўстановы было пададзена 18 тысяч заяў. На бюджэце конкурс склаў 3,2 чалавека на месца. Залічаны 10,1 тысячы абітурыентаў, у тым ліку на бюджэтнае навучанне — 3,5 тысячы, а на платнае — 6,5 тысячы.

***— Скажыце, калі ласка, ці пацвердзілася сёлета тэндэнцыя павелічэння колькасці выпускнікоў базавай школы, якія ў сваім юным узросце ўжо жадаюць атрымаць прафесію?***

— Так, у параўнанні з 2010 годам колькасць тых, хто паступіў на аснове базавай школы, павялічылася на 3%: сярод абітурыентаў дзённай формы ў дзяржаўных ССНУ выпускнікоў базавых школ было 19,4 тысячы.



Выпускнікі сярэдніх школ аддавалі перавагу вышэйшым навучальным установам, іх колькасць у ССНУ зменшылася на 10%. Затое значна больш, аж на 17%, стала абітурыентаў, якія маюць прафесійна-тэхнічную адукацыю. Мяркую, гэта адбылося дзякуючы вялікай сумеснай прафарыентацыйнай рабоце ўстаноў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

***— Якія спецыяльнасці аказаліся самымі папулярнымі?***

— Найбольш папулярныя спецыяльнасці ў ССНУ вызначаюцца паводле конкурсу. Так, конкурс звыш 4 чалавек на адно бюджэтнае месца дзённай формы навучання назіраўся па спецыяльнасцях “Архітэктура” ў Мінскім дзяржаўным архітэктурна-будаўнічым і Віцебскім дзяржаўным тэхнічным каледжах; “Арганізацыя перавозак і кіраванне на чыгуначным транспарце” ў Аршанскім каледжы чыгуначнага транспарту; “Тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў” у Мінскім дзяржаўным аўтамеханічным і Гомельскім дзяржаўным дарожна-будаўнічым каледжах; “Пад'ёмна-транспартныя, будаўнічыя, дарожныя машыны і абсталяванне” ў Мінскім дзяржаўным авіяцыйным каледжы; “Дызайн” у Мінскім дзяржаўным мастацкім вучылішчы; “Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій” у Баранавіцкім дзяржаўным каледжы лёгкай прамысловасці і Полацкім дзяржаўным аграрна-эканамічным каледжы; “Фармацыя” ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім каледжы.

У сувязі з перавытворчасцю кадраў у апошнія гады значна скараціліся аб'ёмы бюджэтнай падрыхтоўкі па спецыяльнасцях эканамічнага і юрыдычнага профіляў. Хаця высокая цікавасць з боку моладзі да гэтых спецыяльнасцей захоўваецца: трымаецца даволі высокі конкурс — прыкладна 5 чалавек на месца — на спецыяльнасці “Правазнаўства”, “Камерцыйная дзейнасць”, “Бухгалтарскі ўлік, аналіз і кантроль”, “Фінансы”.

***— А якія спецыяльнасці абітурыенты абышлі ўвагай? Ці дапамагае запаўняць бюджэтныя месцы той пункт Правіл прыёму, які дазваляе паступаць толькі па дакуменце аб адукацыі на спецыяльнасці, дзе конкурс у папярэднія гады быў менш за 1,5 чалавека на месца?***

— Найменш запатрабаванымі ў абітурыентаў спецыяльнасцямі з'яўляюцца спецыяльнасці тэхнічнага профілю, напрыклад, “Тэхналогія машынабудавання”, “Металарэжучыя станкі і інструменты”, “Машыны і абсталяванне швейнай вытворчасці”, “Машыны і абсталяванне дрэваапрацоўкі”. Гэта і зразумела, бо дысцыпліны вучэбнага плана па тэхнічных спецыяльнасцях дастаткова складаныя, вялікі аб'ём курсавога і дыпломнага праектавання, няпростыя ўмовы праходжання практыкі. Гэта адштурхоўвае абітурыентаў.

Што да другой часткі вашага пытання, то паступаць па конкурсе сярэдняга бала дакумента аб адукацыі псіхалагічна лягчэй, чым здаваць іспыты. Таму такая магчымасць дапамагае ўстановам адукацыі выконваць планы набору.

***— Ці абмяркоўваецца ўвядзенне цэнтралізаванага тэсціравання для выпускнікоў 9-х класаў?***

— Не, увядзенне ЦТ для выпускнікоў базавых школ пакуль не разглядаецца. У гэтым годзе для абітурыентаў, якія паступаюць у ССНУ на дзённую форму навучання на аснове базавай адукацыі, усе ўступныя выпрабаванні (акрамя іспытаў па спецыяльнасці) праводзіліся толькі ў пісьмовым выглядзе па цэнтралізаваных заданнях у фіксаваны дні. Зладжаная дзейнасць РІКВ па распрацоўцы заданняў, крытэрыяў ацэньвання работ, па арганізацыі выдачы камплектаў экзаменацыйных матэрыялаў установам адукацыі адыграла станоўчую ролю ў рабоце прыёмных камісій.

**З 1 верасня гэтага года ўсе ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі сталі каледжамі, што абумоўлена патрабаваннем Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.**

***— Марына Эдуардаўна, уступная кампанія ў ССНУ насамрэч яшчэ не зусім скончылася. Зараз, напрыклад, ідзе прыём замежных грамадзян, а наперадзе — паступленне на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці…***

— Так, прыём замежных грамадзян у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы працягнецца да 1 кастрычніка. Звычайна ў нашых ССНУ замежнікі выбіраюць тэхнічныя спецыяльнасці, а таксама спецыяльнасці, звязаныя з аховай здароўя і бытавым абслугоўваннем.

Прыём на завочную форму атрымання адукацыі па спецыяльнасцях сельскай гаспадаркі і воднага транспарту завершыцца 1 снежня. Нагадаю, што ў нашай краіне каля 20 каледжаў аграрнага профілю, якія ажыццяўляюць навучанне па 12 спецыяльнасцях. Усяго яны плануюць прыняць на завочную форму навучання да 900 навучэнцаў.

**Іна НІКІЦЕНКА.**
*nikitsenka@nastgaz.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

## Учим английский с «Magic Box»!




На сайте издательства «Аверсэв» **www.aversev.by** в разделе «СКАЧАТЬ» вы можете найти и бесплатно скачать:

- **календарно-тематическое планирование** для работы с УМК «Magic Box 1 (2, 3, 4)»;
- **«Magic Box. Книга для учителя. 1 (2, 3, 4) класс»** на русском и английском языках.

Для проведения уроков по английскому языку с использованием УМК «Magic Box 1 (2, 3, 4)» было разработано **примерное календарно-тематическое планирование** в соответствии с требованиями учебной программы, утвержденной Министерством образования Республики Беларусь.

В КТП вы увидите, какие коммуникативные задачи решаются на каждом занятии, какой языковой материал предлагается учащимся для освоения и какие материалы УМК помогают решить поставленные задачи. Также в отдельной графе представлены задания, которые можно предложить учащимся для выполнения дома.

Учебно-методические пособия на русском и английском языках **«Magic Box. Книга для учителя. 1 (2, 3, 4) класс»** (авторы Н. М. Седунова и др.) являются составной частью УМК «Magic Box» и содержат методические рекомендации по проведению уроков.

ОДО «Аверсэв». УНП 100599817. Лицензия № 02330/0003944 от 03.02.09/14 МИ РБ